дапамагае палепшыць камунікацыю, устанавіць дзелавыя кантакты, садзейнічае дасягненню ўзаемаразумення, стварае добрыя, устойлівыя адносіны з партнёрамі і канкурэнтамі.

Неабходнасць авалодання культурай прафесійных зносін абумоўлена тым, што афіцыйныя зносіны пранікаюць ва ўсе сферы жыцця. Уменне наладжваць кантакты з людзьмі, паспяхова весці перагаворы, працаваць з дакументамі – важнейшы элемент культуры сучаснага адукаванага чалавека, які імкнецца дасягнуць поспехаў у жыцці.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1 Бороздина Г.В. Психология делового общения: Учебное пособие. – М.: ИНФРА-М, 1998. – 224 с.

2 Психология и этика делового общения: Учебник для вузов /Под ред. Проф. В.Н. Лавриненко. – 4-е изд., перераб. и доп. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2002. – 415 с.

УДК 174

## АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ЭТЫКІ

*Студэнт – Шытаў М.М., 18 рпт, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Занкавіч А.П., к.філ.н., дацэнт*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца асноўныя прынцыпы сучаснай прафесійнай этыкі.

**Ключавыя словы:** прафесійная этыка, прынцыпы прафесійнай этыкі, этычныя прынцыпы.

Сярод асноўных відаў этыкі вылучаюць агульначалавечую (універсальную) і прафесійную этыку. Апошняя грунтуецца на агульных прынцыпах, нормах, маральных ідэалах і каштоўнасцях агульначалавечай этыкі, аднак мае свае спецыфічныя асаблівасці, абумоўленыя спецыфікай прафесійнай дзейнасці.

Прафесійная этыка выпрацоўвае нормы, стандарты і патрабаванні, характэрныя для пэўных відаў дзейнасці:

- тыка дзелавых адносін на дзяржаўнай службе;
- медыцынская этыка;
- педагагічная этыка;
- прафесійная мараль у журналістыцы (этыка журналіста);

- эканамічная этыка ("дзелавая этыка", "этыка бізнесу", "этыка прадпрымальніцкай дзейнасці", " этыка менеджменту") і інш.

Унутры відаў прафесійнай этыкі вылучаецца мноства падвідаў. Напрыклад, этыка інжынера ў залежнасці ад спецыфікі можа падзяляцца на этыку інжынера-праграміста, этыку інжынера сродкаў сувязі і г.д. У педагагічнай этыцы вылучаюцца этыка педагогаў агульнаадукацыйных навучальных устаноў, выкладчыкаў вышэйшай школы, педагогаў дашкольнага выхавання. У рамках эканамічнай этыкі можна вылучыць этыку прадпрымальніцкай дзейнасці, этыку бізнесу, банкаўскую этыку і г.д.

Такім чынам, прафесійная этыка – гэта кодэкс паводзін, якія ўяўляюцца найлепшымі з пункту гледжання выканання работнікамі сваіх службовых абавязкаў у той ці іншай прафесійнай сферы (у вытворчасці прадукцыі, у кіраўніцкай сферы, на дзяржаўнай службе і інш.).

Буйныя арганізацыі маюць штатных спецыялістаў па дзелавой этыцы.

Рэкамендуецца пытанні па прафесійнай этыцы ўключаць у праграму экзаменаў на прысваенне адпаведнай кваліфікацыі, каб спецыялісты няўхільна выконвалі палажэнні кодэкса прафесійнай этыкі адпаведнай спецыяльнасці.

Адносіны арганізацыі з персаналам рэкамендуецца будаваць па наступных прынцыпах:

- забяспечыць работнікаў працай і заработнай платай, якія па-вышают іх узровень і якасць жыцця;
- стварыць умовы працы для работнікаў, якія не наносяць шкоду іх здароўю і чалавечай годнасці;
- быць сумленным у зносінах са сваімі работнікамі і забяспечыць ім адкрыты доступ да інфармацыі, абмежаванай толькі рамкамі закона і ўмовамі канкурэнцыі;
- прыслухоўвацца і па магчымасці рэагаваць на прапановы ра-ботнікаў;
- у выпадку ўзнікнення канфліктаў удзельнічаць у адкрытых перагаворах з працоўным калектывам;
- • пазбягаць дыскрымінацыйнай палітыкі і гарантаваць персаналу роўныя правы і магчымасці незалежна ад полу, расавай прыналежнасці і рэлігійных перакананняў;
- стымуляваць выкарыстанне працы работнікамі з розным прафесійным узроўнем на тых участках, дзе яны могуць прынесці найбольшую карысць;
- забяспечваць ахову працы, каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў і прафесійных захворванняў;
- заахвочваць работнікаў і дапамагаць у развіцці неабходных навыкаў і ўменняў.

Агульнапрынятымі этычнымі прынцыпамі як для арганізацый, так і для асобных кіраўнікоў лічацца наступныя:

- залатое правіла менеджэра" – у рамках службовага становішча ніколі не дапускаць у адносінах да сваіх падначаленых, да кіраўніцтва, да кліентаў такіх учынкаў, якіх бы не жадалі бачыць у адносінах да сябе;

- авансаванне даверам (у калектыве ствараюцца спрыяльныя ўмовы
- для прыняцця рашэнняў і іх выканання, калі кожнаму чалавеку аказваецца максімальны давер – яго патэнцыялу, кваліфікацыі, пачуццю адказнасці);
- права на свабоду службовых паводзін, учынкаў, дзеянняў кіраўніка або радавога супрацоўніка арганізацыі не толькі ў рамках заканадаўства, але і ў межах, якія не парушаюць свабоду іншых кіраўнікоў або радавых супрацоўнікаў;
- справядлівасць у набыцці паўнамоцтваў, адказнасці, права распараджацца рэсурсамі розных відаў, у вызначэнні тэрмінаў выканання работ і г.д.;
- справядлівасць пры передачы сродкаў і рэсурсаў, а таксама правоў, прывілеяў і льгот;
- максімум прагрэсу (дзеянні супрацоўніка або арганізацыі ў цэлым этычныя, калі яны спрыяюць развіццю арганізацыі, не парушаючы пры гэтым існуючых этычных нормаў).

Падсумоўваючы ўсё сказанае, можна адзначыць, што значэнне прафесійнай этыкі ў цяперашні час цяжка пераацаніць. Ігнараванне яе ў любым выглядзе працоўнай, службовай і прафесійнай дзейнасці будуць мець негатыўныя наступствы і з'яўляцца перашкодай на шляху дасягнення поспеху.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Браим И.Н. Культура делового общения: Учеб. / И.Н. Браим. – Мн.: ИП «Экоперспекимва», 2000. – 174 с.

УДК 811.161.3

## ПРАЎДА І МУЖНАСЦЬ ТАЛЕНТУ Ў ТВОРЧАСЦІ В. БЫКАВА

*Студэты – Паўшок П.В., 86 э, 1 курс, АЭФ;*
*Яўхута У.А., 19 рпт, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Смалянка Г.А., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**. «У артыкуле аналізуецца праўда і мужнасць таленту ў творах В.Быкава, разглядаецца чалавечая стойкасць перад сілай абставін».

**Ключавые словы:** творчасць, вайна, чалавечая стойкасць, мужнасць.

Мінула 75 год з Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а яна не адпускае нашы думкі. Мала ўжо засталося ўдзельнікаў той вайны, але з падзеямі знаёмімся чытаючы творы пісьменнікаў-удзельнікаў баёў. Вось і Васіль Быкаў з упартай паслядоўнасцю працягваў “ваяваць” у сваіх